# Дзейнасць
# грамадскіх арганізацый у Рэспубліцы Польшча, якія аказваюць падтрымку дзецям і моладзі з інваліднасцю на прыкладзе Таварыства сяброў дзяцей

*Арганізацыйная структура Таварыства сяброў дзяцей*

Таварыства сяброў дзяцей (ТСД) - гэта агульнанацыянальная грамадская арганізацыя, сябры якой займаюцца грамадска-карыснай дзейнасцю ў дачыненні да дзяцей і іх бацькоў.

Арганізацыйная структура ТСД суадносіцца з дзяржаўнай структурай, адміністрацыйным дзяленнем Польшчы. Гэта спрашчае кіраванне дзейнасцю арганізацыі па падтрымцы дзяцей.

У цяперашні час арганізацыйная структура Таварыства выглядае наступным чынам:

- першасныя арганізацыі як асноўныя звёны сацыяльнай дзейнасці на пэўнай тэрыторыі жыхарства (у тым ліку ў сельскай мясцовасці), на працоўных месцах, у адукацыйных, медыцынскіх установах (уключна са спецыялізаванымі гурткамі, секцыямі для дзяцей і падлеткаў з інваліднасцю, якія рэалізуюць розныя задачы), моладзевыя клубы;
- раённыя і гарадскія філіі;
- раённыя аддзелы;
- абласныя аддзелы;
- рэгіянальныя аддзелы;
- рада ТСД як незалежная арганізацыйная адзінка, якая выбіраецца прадстаўнікамі рэгіянальных аддзелаў.

Першасныя арганізацыі і раённыя і гарадскія філіі падпарадкоўваюцца раённым аддзелам; раённыя і абласныя аддзелы - рэгіянальным аддзелам і радзе ТСД. Але паказаная арганізацыйная іерархія з'яўляецца фармальнай і ўплывае толькі на структуру ТСД. Пабудова адносін унутры арганізацыі з пазіцый дэмакратыі і незалежнасці дазваляе сябрам ТСД на ўсіх узроўнях дзейнічаць незалежна пры прыняцці рашэнняў, якія тычацца развіцця тых ці іншых напрамкаў дзейнасці, выбару партнёраў па супрацоўніцтве і іншага ў рамках існуючага статута Таварыства. Першасныя арганізацыі могуць дзейнічаць самастойна або добраахвотна ўтвараць філіі. У пасяджэннях рады могуць прымаць удзел не толькі кіраўнікі рэгіянальных аддзяленняў, але і ўсе сябры Таварыства, прадстаўнікі зацікаўленых асоб і СМІ.

Сябры названых структур - бацькі дзяцей і падлеткаў з інваліднасцю, адмыслоўцы ў галіне дагляду за імі, іх адукацыі, лячэння, абароны правоў дзяцей, прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады. Сябрамі Таварыства могуць быць як фізічныя так і юрыдычныя асобы; яны падзяляюцца на шараговых, якія аказваюць канкрэтныя паслугі, і ганаровых сяброў.

Літаратура:

1. Statut Towarzystwa Przyjaciół Dzieci od dnia 28 maja 2011 r.
2. Towarzystwo Przyjaciół Dzieci. Sprawozdanie z działalności w 2011roku. Warszawa, 2012.